дзяржава, дзе ўсё грамадзяне роўныя і шчаслівыя. Яна была выдадзена ў 1623 г. і атрымала сусветную вядомасць, як узор апісання сацыяльнай утопіі. Аднак не ўсім вядома, што “Горад сонца” зусім не ўтопія, а ледзь не "партрэт з натуры” дзяржавы, якая рэальна існавала ў гісторыі.

Гэта дзяржава была створана у пачатку XVII ст. місіянерамі-езуітамі ў Парагваі сярод індзейцаў плямён гуарані. Неразвітасць і першабытнасць гуарані з аднаго боку былі перашкодай для іх цывілізацыі, а з іншага боку гэта акалічнасць з'явілася сур'ёзнай дапамогай для айцоў езуітаў, бо гуарані не ведалі яшчэ прыватнай уласнасці.

Сацыяльны эксперымент езітаў не быў правалам, ім удалася пабудаваць сапраўды моцную дзяржаву. Яе войска налічвала каля 12000 чалавек. Яно было, вырашальнай сілай у гэтым рэгіене і ўмешваліся ў міжусобныя войны, не раз брала штурмам сталіцу Ассунсiён, перамагала партугальскія войскі, вызвалілі Буэнас-Айрэс ад аблогі англічан.

За час існавання дзяржавы езуіты ўкаранілі прагрэсіўныя агратэхнічныя тэхналогіі, у выніку гуарані здолелі цалкам забяспечваць сябе прадуктамі. Сталі квітнець розныя віды рамёстваў, у тым ліку – ювелірнае, гадзіннікавае, швейнае, суднабудаўнічае: гуарані будавалі караблі нават большыя, чым будаваліся ў той час на лонданскіх верфях. Расквіталі мастацкія рамествы: ткацтва, разьба па дрэве і каменю, ганчарная справа.

Аднак, "царству шчасця і дабрабыту", створанаму езуітамі, не наканавана было жыць вечна. Езуітамі ў калоніях былі вельмі незадаволены.

У 1767 г. дзейнасць ордэна езуітаў была забаронена ў Іспаніі і яе ўладаннях. Езуіты паднялі мяцеж супраць іспанскай кароны. Для яго падаўлення было паслана ўрадаве рэгулярнае войска. У выніку адбыўся разгром дзяржавы езуітаў.

УДК 001(092)

## Першапраходец гісторыі Беларусі

Арбузаў А.Ц.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Вацлаў Юсцінавіч Ластоўскі нарадзіўся 8 лістапада 1883г. у сям’і дробнага земляроба-арандатара на віцебшчыне ў Глыбокскім раёне. Скончыў Старапагосцкую школу, вучыўся ў Дзісненскай павятовай вучэльні. У Пецярбургскім універсіцеце слухаў “зайцам” лекцыі, у Рызе

спрабаваў здаць экзамены на атэстат сталасці. Але навуковыя веды атрымаў дзякуючы нястомнай працы самаадукацыяй, што дазволіла яму падняцца на ўзровень самых адукаваных беларускіх інтэлігентаў свайго часу.

У 1906-1907гг. быў сябрам Беларускай сацыялістычнай грамады, з 1909 па 1918 гг. займаўся ў асноўным журналісцкай дзейнасцю. У 1919-1923 гг. – сябра Рады міністраў БНР.У 1923 г. падаў у адстаўку з пасады прэм’ер-міністра БНР. З 1927 па 1930 гг. працаваў дырэктарам Беларускага дзяржаўнага музея, загадчыкам кафедры этнаграфіі ў Інбелкульце. З утварэннем Акадэміі навук БССР быў яе неадменным вучоным сакратаром.

В.Ю. Ластоўскі актыўна займаўся грамадскай і культурнай дзейнасцю. З 1909 па 1914гг. працаваў у Вільні сакратаром рэдакцыі газеты “Наша Ніва” і стаў адным з самых адданых падзвіжнікаў адраджэнскага руху. Менавіта ў гэты пярыяд усё больш поўна пачаў раскрывацца яго шматгранны незвычайны талент гісторыка, моваведа, літаратара.

У 1910г. ён апублікаваў “Кароткую гісторыю Беларусі” – першую папулярную працу па гісторыі роднага края, напісанную сапраўдным беларусам для беларусаў. У далейшым з’явіліся кнігі ”Што трэба ведаць кожнаму беларусу” і “Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі”, пасля выдання якой у 1926 г. Язэп Янушкевіч сказаў, што Ластоўскі В.Ю. змог зрабіць больш, чым некалькі акадэмічных інстытутаў.

21 ліпеня 1930 г. ён быў арыштаваны, пазбаўлены звання акадэміка і ў красавіку 1931 г. высланы на 5 гадоў у Саратаў. У другі раз там жа 20 жніўня 1937 г. быў арыштаваны, а 23 студзеня 1938г. прыгавораны да вышэйшай меры пакарання.

УДК 93/99 (9) (327.1)

## Многообразие границ социального пространства

Семёнова Л.Н.
Белорусский национальный технический университет

Размышляя о пространственной организации мира, Ф. Бродель заметил, что многие трагедии в истории связаны с «несовпадением границ». Что же делает границы не столько фиксацией протяженности общественно-политических организмов, символами их размежевания между собой, сколько «шрамами истории», как гласит известная поговорка?

Ткань социальной материи густо прошита порой грубыми и суровыми,